6. *Любавский М. К.* Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута: Ист. очерки. М., 1892.
7. *Спрогис И. Я.* Предисловие // Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. Т. XVIII. Акты о копных судах. Вильна, 1891.
8. *Черкаськїй І.* Громадськїй (копнїй) суд на Україні – Русі XVI – XVIII вв. // Праці комісії для виучування історії західно-руського та вкраїнського права. – К., 1928. Вип. 4.
9. *Шкялёнак М. В.* Беларусь і суседзі: Гістарычныя нарысы. Беласток, 2003. – С. 196 – 217.
10. *Юхо І. А.* Копныя суды старажытнай Беларусі // Юстыцыя Беларусі. – 1999. – №4 (7). – С. 55 – 59.
11. *Ясинский М. Н.* Материалы для истории судоустройства и судопроизводства в Литовско-Русском Государстве. Акты о копных и панских судах. Киев, 1897. Т. I.: 1501 – 1588.

# ПАВЯТОВЫЯ ПРАДВАДЗІЦЕЛІ ДВАРАНСТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў 60–90-Я ГГ. ХІХ СТАГОДДЗЯ

**Я. В. Уласавец**

Павятовыя прадвадзіцелі дваранства з часоў утварэння пасады ў 1766 годзе адыгрывалі вялізную ролю ў сістэме мясцовага кіравання Расійскай імперыі. Выключнае становішча дадзенага інстытута тлумачыцца асаблівасцямі расійскага заканадаўства, якое не прадугледжвала павятовага звяна ў бюракратычным апараце, у выніку чаго пасада павятовых прадвадзіцеляў, першапачаткова створаная выключна для выканання ўнутрысаслоўных функцый, у хуткім часе пачала выконваць шматлікія сталыя адміністрацыйныя загады [1, с. 35]. Эпоха Вялікіх рэформаў не толькі не зменшыла ролю павятовых прадвадзіцеляў, але нават умацавала іх становішча ў сувязі з непасрэдным удзелам прадвадзіцеляў у правядзенні распачатых рэформ.

Сітуацыя на беларускіх землях была яшчэ больш цікавай, што было выклікана спецыфічным курсам, правадзімым расійскім урадам у дачыненні да мясцовага, пераважна каталіцкага па веравызнанню, дваранства, а гэта значыць і павятовых прадвадзіцеляў як найбольш яскравых прадстаўнікоў беларускага набілітэту.

Айчынная і замежная гістарыяграфія ўтрымлівае значную колькасць даследаванняў па дадзенай тэматыцы, аднак да гэтага часу няма ніводнага падагульняючага даследавання, якое спалучала бы дасягненні розных гістарыяграфічных накірункаў. Адсутнасць падобнага рода сінтэзы значна павышае актуальнасць азначанай тэматыкі, што і стала падставай для напісання дадзенай працы, мэтай якой з’яўляецца спроба падагульнення дасягненняў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, а таксама ўведзеных у

навуковы зварот крыніц. У рамках гэтага даследавання было паспрабавана вызначыць месца павятовых прадвадзіцеляў дваранства ў падзеях 60-х гадоў XIX стагоддзя, а таксама асаблівасці ўрадавай палітыкі ў дачыненні да азначанага інстытута і іх прычыны.

Пераломным момантам у гісторыі павятовых прадвадзіцеляў дваранства быў уздым нацыянальна-вызваленчага руху на пачатку 60-х гадоў XIX стагоддзя, кульмінацыяй якога стала паўстанне 1863-1864 гадоў. Значныя змены ва ўрадавым курсе былі абумоўлены актыўным удзелам павятовых прадвадзіцеляў дваранства спачатку ў маніфестацыйным руху [2, с. 135; 3, с. 49], а потым і ў падачы на найвысачэйшае імя адрасаў [4, с. 78]. Пры гэтым варта адзначыць, што падзел грамадства напярэдадні і ў гады паўстання на розныя ідэйныя плыні не абмінуў і павятовых прадвадзіцеляў, сярод якіх траплялiся як прадстаўнікі «чырвонага» (Брахоцкі, Жылінскі), так і шматлікіх накірункаў «белага» рухаў. У прыватнасці, прыхільнікамі групоўкі графа Старжынскага, якая імкнулася да так званага «примирения» з урадам шляхам узаемных саступак, былі прадвадзіцелі: дынабургскі Станіслаў Зіберг-Плятэр, гродненскі Аляксандр Друцкі-Любецкі і іншыя [3, с. 98, 107, 109; 5, с. 130]. Сярод чальцоў групоўкі Якуба Гейштара, якая хоць і лічыла паўстанне несвоечасовым, але выступала за адзінства ўсіх палітычных лагераў і таму прымкнула да паўстання, былі павятовыя прадвадзіцелі Ковенскай губерніі граф Чапскі, граф Плятэр, Шэмет, Пётнух і Конча [6, с. 220–221]. Разам з тым частка прадстаўнікоў кансерватыўнага накірунку, нягледзячы на часовае дачыненне да руху «белых», хутка адышла ад яго і падцвердзіла сваю лаяльнасць да расійскіх улад, у выніку большасць з іх захавала свае пасаду, а некаторыя нават іх атрымалі.

Зразумела, што расійскі ўрад не мог не перагледзіць сваю палітыку ў дачыненні да павятовых прадвадзіцеляў як прадстаўнікоў страціўшага давер мясцовага дваранства. Першыя крокі ў гэтым накірунку былі зроблены яшчэ пры Уладзіміры Іванавічы Назімаве, які выказваў думку, што «подобного рода демонстрации могли бы быть обращены в пользу правительства, чтобы освободиться раз навсегда от влияния польского дворянства» [7, с. 5], але фундамент новага курса заклаў прызначаны на пасаду віленскага генерал-губернатара Міхаіл Мікалаевіч Мураўёў, пры якім, паводле пастаноў ад 16 ліпеня і 2 лістапада 1863 года, адбылася канчатковая ліквідацыя інстытута выбарных прадвадзіцеляў дваранства і ператварэнне яго ў звычайны бюракратычны орган кіравання [8, 20]. Акрамя гэтага была распачата новая хваля русіфікацыі, адным з накірункаў якой была замена так званых «літоўскіх палякаў» рускімі чыноўнікамі ў адміністрацыйным апараце. Не абмінала гэтая тэндэнцыя і інстытут прадвадзіцеляў дваранства. Заходні камітэт, разгледзеўшы

запіску Мураўёва, указам ад 27 траўня 1864 года пастанавіў замяшчаць усе вышэйшыя службовыя месцы ў краі, а таксама і месцы асобных начальнікаў, якія мелі непасрэднае дачыненне да народа, выключна асобы рускага паходжання [9, с. 41]. Аднак нельга спрашчаць дадзеную з’яву, бо падчас дзейнасці Мураўёўскай адміністрацыі на сваіх пасадах засталося 8 павятовых прадвадзіцеляў каталіцкага веравызнання, а 11 было прызначана на пасады [10, с.124–168; 11, с. 87–134; 12, с. 13–89; 13, с. 61–79; 14, с. 165–236; 15, с. 111–236; 16, с. 89–146]. Гэтыя факты гавораць аб тым, што на дадзеным этапе асабістая адданасць прадвадзіцеляў ставілася вышэй за іх веравызнанне.

Наступным крокам у адносінах да інстытута павятовых прадвадзіцеляў дваранства з боку расійскай адміністрацыі былі пастановы ад 17 сакавіка 1867 і ад 15 ліпеня 1868 гадоў. Паводле першай пастановы віленскаму-генерал губернатару было прадастаўлена права замяшчаць, па меры магчымасці, пасады павятовых прадвадзіцеляў дваранства мясцовымі дваранамі-землеўласнікамі не польскага паходжання, у той час як другая дазваляла ў выключных выпадках прызначаць прадвадзіцеляў з ліку асоб польскай нацыянальнасці [9, с. 41–42], што, на думку шэрага даследчыкаў, было адной з праяў пэўнай лібералізацыі адносін у дачыненні да мясцовага дваранства з боку расійскага ўраду [17, с. 81–82; 18, с. 205]. Аднак, не аспрэчваючы цалкам гэты тэзіс, трэба дадаць, што першая пастанова толькі ўдакладняла ўмовы прызначэння на пасаду, але пры гэтым яна садзейнічала абрусенню беларускіх губерняў, якое  напрамую атаясамлялася ўрадам з павелічэннем колькасці рускіх памешчыкаў. Другая ж пастанова не магла прывесці, як паведамляюць некаторыя даследчыкі, да заняцця большасці пасад прадвадзіцеляў католікамі, бо акрамя тых асоб, што былі прызначаны яшчэ ў часы Мураўёва, новых факта прызначэння на пасаду не выяўлена. Больш таго, у хуткім часе (з 1867 па 1873 гады) назіраецца 15 выпадкаў заменены прадвадзіцеляў-католікаў праваслаўнымі памешчыкамі [19, с. 123–155; 20, с. 189–218; 21, с. 249–305; 22, с. 67–176; 23, с. 423–429]. Пэўныя выключэнні складалі толькі Ковенская і Віленская губерня, дзе азначаныя працэсы не набылі такі размах.

Лагічным працягам урадавага курса было прыняцце закона ад 30 траўня 1888 года, які аднаўляў у беларускіх губернях з’езды міравых пасрэднікаў, а прадвадзіцеляў рабіў адначасова старшынямі міравых з’ездаў, а ў Магілёўскай губерніі – старшынёй павятовых па сялянскім справам прысутнасцяў [24, с. 810]. Аднак гэта супярэчыла закону ад 27 траўня 1864 года, што і стала падставай для звальнення да 1890 года

усіх павятовых прадвадзіцеляў каталіцкага веравызнання [18, с.205–206]. Прычым такое становішча захоўвалася да самай ліквідацыі інстытута прадвадзіцеляў дваранства ў 1917 годзе.

Такім чынам, на падставе вышэйзгаданай інфармацыі можна зрабіць выснову, што пасля паўстання 1863-1864 гадоў распачаты расійскім урадам курс на русіфікацыю краю досыць паслядоўна праводзіўся і ў дачыненні да інстытута павятовых прадвадзіцеляў дваранства.

**Літаратура**


1. *Корелин А.П.* Институт предводителей дворянства. О социальном и политическом положении дворян // История СССР. 1978, № 2. С.31–48.
2. *Ратч В.Ф.* Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-Западной России. Т.1. Вильна, 1867.
3. *Fajnhauz D.* 1863: Litwa i Białoruś. Warszawa, 1999.
4. *Смирнов А.Ф.* Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии. М., 1963.
5. *Комзолова А.А.* Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. М., 2005.
6. Архивные материалы Муравьёвского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края // Виленский временник. Вильна, 1913. Кн. VI.
7. *Жытко А.П.* Адносіны царызму да дзяржаўнай службы дваран Беларусі (1861-1914) // Гісторыя: праблемы выкладання. 2003, №3. С. 3–9.
8. *Токць С.М.* Шляхецкае самакіраванне ў Гродзенскай губерні (пачатак XIX ст. – 60-ыя гады XIX ст.) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Bialystok., 1997. № 7. С. 5–22.
9. Справка по вопросу о восстановлении собраний и выборов дворянства в девяти западных губерниях. Составлена канцелярией Постоянного совета объединённых дворянских обществ, ч. 1-2. СПб, 1914.
10. Памятная книжка Виленской губернии на 1864 год. Вильна, 1864. С. 124–168.
11. Памятная книжка Витебской губернии на 1862 год. Витебск, 1862. С.87–134.
12. Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год. СПб, 1865. С. 13–89.
13. Памятная книжка Гродненской губернии на 1866 год. Гродно, 1866. С. 61–79.
14. Памятная книжка Минской губернии на 1866 год. Минск, 1866. С. 165–236.
15. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1863 год. Могилёв, 1862. С. 111–236.
16. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1871 год. Могилёв, 1871. С. 89–146.
17. *Самбук С.М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980.
18. *Жытко А.П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861-1914 гг. Мн., 2003.
19. Памятная книжка Виленской губернии на 1871 год. Вильна, 1870. С. 123–155.
20. Памятная книжка Виленской губернии на 1876 год. Вильна, 1875. С. 189–218.
21. Памятная книжка Витебской губернии на 1884 год. Витебск, 1884. С. 249–305.
22. Памятная книжка Минской губернии на 1874 год. Минск, 1873. С. 67–176.
23. *Szczuka L.* Marszałkowie szlachty gubernji grodzieńskiej // Ateneum Wilienski. Wilno, 1924. Cz. II. С. 423–429.

24. *Рубинштейн С.Ф.* Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет, с 1652 по 1892 год. Вильна, 1894.

# УЗАЕМАПРАНІКНЕННЕ ТАТАРСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУР

**М. А. Гембіцкая**

Пасяленне часткі татар-мусульман на Беларусі ў сярэднявеччы было важнай гістарычнай з'явай. Яны адыгралі станоўчую ролю ў беларускай нацыянальнай гісторыі. Спрыяльнае становішча татар у ВКЛ садзейнічала іх цеснаму ўзаемадзеянню з мясцовым усходнеславянскім насельніцтвам, палітычнаму і культурнаму збліжэнню з ім.

Роля татар-мусульман ў беларускай гісторыі шматзначная. Яны не толькі мужна баранілі зямлю, на якой сталі жыць, але і прынялі ўдзел у такім важным гістарычным працэсе, як беларускі этнагенез.

За стагоддзі, што татары жывуць на новай радзіме, яны шмат перанялі ад народаў Беларусі, самі зрабілі пэўны ўплыў на іх. Большасць беларускіх татараў успрыняла шмат аўтэнтычна-беларускага і наадварот.

Спачатку, у XIV–XVI стст., татарскія перасяленцы на Беларусі захоўвалі родную мову і традыцыі ў амаль нязменным выглядзе. Аднак у далейшым, на працягу наступных стагоддзяў, пад уплывам шэрагу фактараў беларускія татары паддаліся асіміляцыйным працэсам, пачалі паступова страчваць сваю мову, часткова веру, некаторыя рысы светаўспрымання, забываць свае старадаўнія абрады, звычаі. У XVII-XIX стст. значная колькасць татарскага насельніцтва карысталася ў паўсядзённым жыцці беларускай ці польскай мовай [3, с. 127].

З цягам часу частка татарскага насельніцтва прыняла хрысціянаства, але ў значнай меры татары, нягледзячы на тэндэнцыю да асіміляцыі, у асноўным усё ж захавалі сваю рэлігію – мусульманства суніцкага толку. Татары імкнуліся зберагчы асобныя самабытныя рысы свайго традыцыйнага гаспадарчага жыцця, хатняга побыту, народнага адзення, фальклору. Алё ў выніку ўзмацнення міжнацыянальных кантактаў, узвемаўплываў культур і моў насяляючых Беларусь народаў этнакультурныя адрозненні паміж татарамі і беларусамі ў XIX – пачатку XX ст. прыкметна зменшыліся, а ў асобных сферах амаль зусім зніклі [3, с. 128].

Тым не менш, беларускія татары, адасобленыя на працягу стагоддзяў ад ісламскага свету, зберaглі сваю веру, традыцыі і культуру. Іслам быў галоўным фактарам, які спрыяў захаванню нацыянальнай свядомасці беларускіх татараў у іншаэтнічным асяроддзі. На беларускіх землях не ўзнікалі міжэтнічныя і міжканфесіянальныя канфлікты паміж татарамі і